**Завод зборнага жалезабетону № 6 — адзін з асноўных пастаўшчыкоў жалезабетонных вырабаў на будаўнічыя пляцоўкі горада, а таксама вырабаў буйнапанельнага домабудавання. Прадукцыя прадпрыемства ідзе ў многія гарады рэспублікі.**

**З кожным годам завод расце, расшыраецца, удасканальваюцца тэхнічныя працэсы, павышаецца прадукцыйнасць працы.**

**Толькі за два апошнія гады, пасля мінулых выбараў, выпуск таварнай прадукцыі тут вырас у паўтара раза, жалезабетону — на 20 тысяч кубічных метраў, прадукцыйнасць працы павысілася ў паўтара раза, фондааддача — на 12 працэнтаў, сабекошт прадукцыі знізіўся на 2,3 капейкі, сярэднемесячная зарплата работнікаў павялічылася на 15 рублёў.**

**Добрых вытворчых паказчыкаў дабіваецца калектыў і сёлета. Жалезабетоншчыкі нямала робяць для таго, каб паспяхова выканаць заданні чацвёртага года пяцігодкі, дастойна сустрэць 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна.**

**Аб тых зменах, што адбыліся з часу апошніх выбараў, і пойдзе расказ на гэтай старонцы.**

# *КЛЮЧ ДА ПОСПЕХУ*

Два гады... Многа гэта ці мала? Для нашага прадпрыемства (і дабавім: растучага) яны прынеслі вельмі многа добрых змен. Пабывайце ў любым месцы завода— усюды ўбачыце прыкметы новага. За гэты час уведзены ў эксплуатацыю два новых фармовачных пралёты, новы бетоназмяшальны вузел. Паявілася шмат новай тэхнікі, механізмаў, якія аблягчаюць працу чалавека. Абсталяваны бытавыя памяшканні, добраўпарадкавана тэрыторыя прадпрыемства. Асноўныя вытворчыя працэсы, пачынаючы ад падачы ў цэх бетону і канчаючы адгрузкай гатовай прадукцыі на склад, механізаваны.

А раней гэтага не было. Да 1967 года мы не мелі, напрыклад, ніводнай канвеернай машыны. Цяпер жа выкарыстоўваецца чатыры такія агрэгаты. У распараджэнні жалезабетоншчыкаў дзевятнаццаць кранаў розных марак, іншыя дасканалыя механізмы.

Жыццё не стаіць на месцы. Яно ўладна ўносіць свае карэктывы, новыя запатрабаванні. Адно з іх — пастаянная мадэрнізацыя абсталявання, укараненне новай тэхнікі і навуковай арганізацыі працы. Возьмем арматурны цэх. Тут тэхнічнаму прагрэсу адводзяць шмат увагі. Застрэльшчыкамі ў гэтай справе з'яўляюцца слесар В. П. Грынько, механік Я. Н. Хоміч, начальнік цэха А. Г. Шашкоў. З іх дапамогай укаранёны аўтаматычныя лініі для вырабаў зварных арматурных каркасаў, паўаўтаматычныя лініі па выпрабу зварных сетак шырынёй да 3 метраў, лінію непарыўнай стыкоўкі арматурнай сталі, дазволіўшай да мінімуму скараціць адходы металу.

Усе гэтыя мерапрыемствы даюць магчымасць палепшыць якасць прадукцыі, знізіць яе сабекошт. Якасць панеляў цяпер правяраюць пры дапамозе ўльтрагука. Укаранілі рад іншых прыбораў для праверкі правільнасці ўстаноўкі арматуры, прагібаў канструкцый і г. д.

Укараняюцца больш дасканалыя формы арганізацыі вытворчасці. Калі раней, напрыклад, аплата працы работнікаў праводзілася ў залежнасці ад колькасці выпускаемай прадукцыі (за выключэннем размеру прэміяльных), то цяпер укараняецца дыферэнцыраваная аплата, гэта значыць яна знаходзіцца ў непасрэднай залежнасці ад якасці выпускаемых вырабаў.

На заводзе стала правілам крытычна разглядаць і аналізаваць усе паступаючыя ад праектных арганізацый тэхналагічныя рашэнні, а таксама існуючыя тэхналагічныя лініі з пункту гледжання навуковай арганізацыі працы і перадавога вопыту. Як правіла, прыходзіцца ўносіць значныя змяненні, а зачастую распрацоўваць новую тэхналогію ўзамен устарэўшай. Гэта, зразумела, дастаўляе многа клопатаў, затое такія адносіны даюць магчымасць увесь час удасканальваць вытворчасць.

У бягучым годзе перад калектывам завода стаіць складаная задача: павялічыць выпуск вырабаў зборнага жалезабетону на 11,3 працэнта, поўнасцю асвоіць праектную магутнасць завода і выпусціць 92 тысячы кубічных метраў вырабаў зборнага жалезабетону, павысіць прадукцыйнасць працы на 6 працэнтаў, дабіцца больш высокай якасці выпускаемай прадукцыі і асвоіць цэлы рад відаў новай прадукцыі.

**Р. КАПЛАН,**
**галоўны інжынер завода.**